© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

УВАГА! *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.*

Дэманстрацыйны варыянт экзаменацыйнай (тэставай) работы

Грамадазнаўства

Варыянт змяшчае 38 *заданняў і складаецца з часткі* А *(*16 *заданняў) і часткі* В *(*22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

Частка А

У заданнях часткі А ***толькі адзін*** *з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

А1. Псіхолаг, які распрацаваў так званае кола эмоцый, – гэта:
1) К. Роджэрс;
2) Г. Спенсер;
3) Р. Плутчык;
4) П. Сарокін;
5) І. Паўлаў.

А2. Здольнасць ацаніць сябе і свой стан па пэўных крытэрыях – гэта:
1) рашучасць;
2) ранімасць;
3) нетаропкасць;
4) жыццярадаснасць;
5) крытычнасць.

А3. Адным з тыпаў тэмпераменту з'яўляецца:
1) аптыміст;
2) канфарміст;
3) эгаіст;
4) халерык;
5) інтраверт.

А4. Сям'я з'яўляецца групай:
1) фармальнай;
2) малой;
3) прадпісанай;
4) апасродкаванай;
5) пасяленчай.


А5. Да нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у дэмаграфічнай сферы адносіцца:
1) аптымізацыя міграцыйных патокаў;
2) рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў;
3) развіццё аграэкатурызму;
4) павелічэнне колькасці жанчын-кіраўнікоў;
5) даследаванне касмічнай прасторы з мірнымі мэтамі.

А6. Адзін са сфармуляваных Р. Мертанам базавых прынцыпаў навуковай дзейнасці, згодна з якім вучоныя павінны падвяргаць выказаныя ідэі крытычнаму абмеркаванню, – гэта прынцып:
1) эгалітарнасці;
2) агульнасці;
3) арганізаванага скептыцызму;
4) кансьюмерызму;
5) бескарыслівасці.

А7. *Павел выбраны старастай класа, паколькі мае арганізатарскія здольнасці. У яго атрымліваецца паспяхова ўзаемадзейнічаць як з аднакласнікамі, так і з навучэнцамі іншых класаў. Таксама Павел з'яўляецца лідарам школьнай каманды па валейболе.* **Дадзены прыклад дэманструе, што ў Паўла развіта такая кампетэнцыя XXI стагоддзя, як:**

1) канфідэнцыяльнасць;
2) крытычнае мысленне;
3) крэатыўнасць;
4) канкурэнцыя;
5) кааперацыя.

А8. Выберыце правільны варыянт запаўнення схемы.



1) А – калі расце цана на адзін тавар, спажыўцы купляюць больш другога тавару, Б – аўтамабіль і бензін;
2) А – калі расце цана на адзін тавар, спажыўцы купляюць менш другога тавару, Б – ялавічына і мяса птушкі;
3) А – такія тавары спажываюцца адначасова, Б – падушка і коўдра;
4) А – такія тавары спажываюцца адначасова, Б – зубная шчотка і зубная паста;
5) А – калі расце цана на адзін тавар, спажыўцы купляюць больш другога тавару, Б – торт і пірожнае.

А9. *Уладальнік невялікай кандытарскай з мэтай пашырэння вытворчасці ўзяў у арэнду дарагі прамысловы міксер і прафесійную печ. Пасля двух гадоў выкарыстання гэтага абсталявання ён выкупіў яго і зрабіў сваёй уласнасцю.* **У дадзеным прыкладзе гаворка ідзе пра такую эканамічную з'яву, як:**

1) дэпазіт;
2) эмісія;
3) аблігацыя;
4) роялці;
5) лізінг.

А10. Адным з метадаў барацьбы з інфляцыяй з'яўляецца:

1) памяншэнне колькасці тавараў і паслуг, прапанаваных да продажу;
2) скарачэнне колькасці грошай у абарачэнні;
3) павышэнне попыту на тавары і паслугі;
4) павелічэнне выдаткаў на сыравіну, што выкарыстоўваецца ў вытворчасці, і іншыя вытворчыя расходы;
5) павелічэнне дзяржаўных расходаў.

А11. Выберыце варыянт адказу, абодва элементы якога з'яўляюцца галоўнымі крыніцамі міжнароднага гуманітарнага права:

а) Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах 1966 г. **б)** Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах 1966 г. **в)** Гаагскія канвенцыі і дэкларацыі 1899 г. і 1907 г., якія рэгулююць сродкі і метады вядзення баявых дзеянняў **г)** Жэнеўскія канвенцыі 1949 г., якія абараняюць ахвяр вайны **д)** Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.	**1)** а, д **2)** г, д **3)** в, д **4)** в, г **5)** б, д

А12. Сістэма «стрымлівання і процівагі» з'яўляецца праяўленнем такога прынцыпу дэмакратыі, як:

1) выбарчы цэнз;
2) радыкалізм;
3) падзел улад;
4) вяршэнства права;
5) суверэнітэт народа як крыніца ўлады.

А13. Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прыняла Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека ў:

1) 1945 г.;
2) 1948 г.;
3) 1959 г.;
4) 1966 г.;
5) 1989 г.

А14. У Рэспубліцы Беларусь да дадатковых адміністрацыйных спагнанняў адносіцца:

1) пазбаўленне волі на пэўны тэрмін;
2) адміністрацыйны арышт;
3) канфіскацыя;
4) штраф;
5) звальненне.

А15. Выберыце правільнае сцверджанне.

1) У Рэспубліцы Беларусь асноўным спосабам прызнання дзяржавай пэўнай арганізацыі ў якасці фізічнай асобы выступае дзяржаўная рэгістрацыя.
2) У Рэспубліцы Беларусь маёмасныя адносіны, якія рэгулююцца грамадзянскім правам, уключаюць адносіны па абароне годнасці.
3) Да фізічных асоб у Беларусі адносяцца камерцыйныя і некамерцыйныя арганізацыі.
4) У Рэспубліцы Беларусь дзейнасць некамерцыйных арганізацый накіравана на дасягненне грамадскіх даброт і не прадугледжвае атрымання прыбытку.
5) Грамадзянскае права ў Рэспубліцы Беларусь прадугледжвае такі базавы крытэрый грамадзянска-прававых адносін, як юрыдычная няроўнасць іх удзельнікаў.

А16. У Рэспубліцы Беларусь барацьбу з кантрабандай ажыццяўляе:

1) Дзяржаўны мытны камітэт;
2) Камітэт дзяржаўнага кантролю;
3) Канстытуцыйны Суд;
4) Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз;
5) Міністэрства юстыцыі.

Частка В

Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі В*, запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, указаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

У заданні **В1** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАЙ****. Напрыклад:* **1**.

В1. Адзначце, колькі прыкладаў трансфертаў прыведзена ў спіску: прыбытак, стыпендыя, пенсія па ўзросце, дывідэнды, працэнты па ўкладзе, грашовая дапамога па беспрацоўі.

У заданнях **В2–В3** *дапоўніце сказ. Адказ запішыце* ***СЛОВАМ*** *у той форме, у якой яно павінна быць выкарыстана ў сказе.*

В2. У Рэспубліцы Беларусь выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць, а падрыхтоўка і правядзенне выбараў праходзяць адкрыта і галосна. Гэта з'яўляецца праяўленнем такога прынцыпу выбарчага права, замацаванага ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, як _____ выбары.

В3. Адзін з асноўных сацыяльных класаў у сучаснай сацыяльна-класавай структуры, прадстаўнікі якога:

а) маюць устойлівыя даходы, дастатковыя для задавальнення шырокага кола матэрыяльных і сацыяльных патрэб;

б) складаюць у сучасны момант большую частку насельніцтва развітых краін, дзе фарміруюць і выказваюць грамадскую думку, з'яўляюцца гарантам сацыяльнай стабільнасці, – гэта _____ клас.

У заданні **В4** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАЙ****. Напрыклад:* **1**.

В4. Выберыце з указаных правоў тое, якое ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь непаўналетнія атрымліваюць ПАЗНЕЙ (у больш сталым узросце):

1) права самастойна здзяйсняць здзелкі, якія накіраваны на бязвыплатнае атрыманне выгад і не патрабуюць натарыяльнага зацвярджэння або дзяржаўнай рэгістрацыі;

2) права самастойна заключаць працоўны дагавор;

3) права самастойна распараджацца сваёй стыпендыяй.

У заданні **В5** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАМІ****, захоўваючы атрыманую паслядоўнасць. Напрыклад:* **1234**.

В5. Размясціце дзяржаўныя святы і святочныя дні, якія абвешчаны непрацоўнымі днямі ў Рэспубліцы Беларусь, у парадку іх святкавання на працягу каляндарнага года (ад 1 студзеня да 31 снежня):

1) Дзень жанчын;

2) Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь;

3) Свята працы;

4) Дзень Перамогі.

У заданнях **В6–В12** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАМІ*** *(парадак запісу лічбаў не мае значэння, колькасць лічбаў у адказе ва ўказаных заданнях можа адрозніваца). Напрыклад:* **12** *або* **153**.

В6. Адзначце манапольныя правы і паўнамоцтвы дзяржавы:

1) прымяняць прымус;

2) прымаць законы;

3) ствараць культуру;

4) спаганяць падаткі;

5) фарміраваць самасвядомасць;

6) ажыццяўляць гандаль.

В7. Адзначце прыклады палітычных партый у дачыненні да існуючага ладу:

1) цэнтрысцкія;
2) масавыя;
3) рэфармісцкія;
4) рэвалюцыйныя;
5) кадравыя.

В8. Адзначце сусветныя рэлігіі:


1) хрысціянства;
2) канфуцыянства;
3) індуізм;
4) будызм;
5) іўдаізм;
6) іслам.

В9. Адзначце, каму ў Рэспубліцы Беларусь належыць права заканадаўчай ініцыятывы:

1) Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь;
2) дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;
3) Камітэт дзяржаўнай бяспекі;
4) Урад Рэспублікі Беларусь;
5) мясцовыя адміністрацыі;
6) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

В10. Выберыце правільныя сцверджанні.

Структура расходаў дамашніх гаспадарак па асноўных групах спажывецкіх расходаў у Рэспубліцы Беларусь у 2024 г.;
у працэнтах да выніку



Згодна з данымі дыяграмы ў 2024 г.:

1) Як у дамашніх гаспадарак, якія пражываюць у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, так і ў дамашніх гаспадарак, якія пражываюць у сельскіх населеных пунктах, расходы на аплату паслуг складалі самую нязначную частку спажывецкіх расходаў.
2) У дамашніх гаспадарак, якія пражываюць у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, асноўным пунктам спажывецкіх расходаў былі расходы на харчаванне.
3) У дамашніх гаспадарак, якія пражываюць у сельскіх населеных пунктах, расходы на харчаванне былі меншыя за расходы на непрадуктовыя тавары.
4) У дамашніх гаспадарак, якія пражываюць у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, расходы на непрадуктовыя тавары былі большыя за расходы на харчаванне.
5) У дамашніх гаспадарак, якія пражываюць у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, расходы на непрадуктовыя тавары складалі больш значную частку спажывецкіх расходаў, чым у дамашніх гаспадарак, якія пражываюць у сельскіх населеных пунктах.

В11. Выберыце правільныя сцверджанні, якія характарызуюць розныя праяўленні маралі.

1) Да відаў прафесійнай этыкі адносяцца педагагічная, медыцынская, юрыдычная, этыка вучонага.
2) Станоўчая фармулёўка залатога правіла маралі гучыць як «не абыходзься з іншым так, як не хочаш, каб абышліся з табой».
3) Клятва ўрачоў, якая выражае асноватворныя маральна-этычныя прынцыпы паводзінаў урача, называецца клятвай Платона.
4) Сумленне часта называюць формай самакантролю і самаацэнкі з пазіцыі выканання маральных нормаў.
5) Паняцце гонару падкрэслівае значнасць асобы як прадстаўніка пэўнай групы людзей, грамадства.
6) Сумленне з'яўляецца знешнім рэгулятарам паводзінаў чалавека.

В12. Выберыце правільныя сцверджанні, якія характарызуюць розныя віды культуры.

1) Да прычын фарміравання маладзёжных субкультур адносіцца імкненне падлеткаў «выпрабаваць на трываласць» каштоўнасці, прапанаваныя светам дарослых.
2) Агрэсіўная субкультура заснавана на культе фізічнай сілы.
3) Контркультура з'яўляецца культурай, каштоўнасці якой пераважаюць у грамадстве.
4) Дамінуючая культура прапануе альтэрнатыўную сістэму каштоўнасцей.
5) Паміж дамінуючай культурай і субкультурай могуць устанаўлівацца партнёрскія адносіны.
6) Вылучаюць такія віды дамінуючай культуры, як эпатажная, альтэрнатыўная і палітычная.

У заданні **В13** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАМІ****, парадак запісу лічбаў не мае значэння. Напрыклад:* **12**.

В13. У воблаке паняццяў зашыфравана мадэль развіцця сучаснага грамадства. Выберыце характарыстыкі дадзенай мадэлі развіцця са спіска:

1) уключае сацыяльны, экалагічны і эканамічны напрамкі;
2) была распрацавана Д. Бэлам;
3) з'яўляецца адным з напрамкаў антыглабалізму;
4) сфарміравалася ўжо ў пачатку XIX ст.;
5) з'яўляецца адным з прынцыпаў міжнароднага права;
6) уключае 17 Мэт.



У заданнях **В14–В16** *адказ запішыце ў выглядзе* ***СПАЛУЧЭННЯ ЛІТАР І ЛІЧБАЎ****, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар верхняга рада. Напрыклад:* **А1Б6В4**.

Памятайце, што некаторыя даныя ніжняга рада могуць не выкарыстоўвацца.

В14. Устаўце ў прыведзеным тэксце на месцы пропускаў словы (словазлучэнні) з прапанаванага спіска, якія падыходзяць па сэнсе. Выбірайце словы (словазлучэнні) паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх у патрэбнай форме.

Філасофія займае асаблівае месца ў сістэме культуры. Філасофія зарадзілася на аснове такой формы пазнання свету, як **А)** _____, дзе таксама ствараліся свайго роду карціны светабудовы. Аднак філасофія адрозніваецца ад яе **Б)** _____. Філасофія, як правіла, будуе свае сістэмы светатлумачэння **В)** _____

1)	доказнасць і дакладнасць паняццяў	**3)**	міфалогія	**5)**	на рацыянальнай аснове
2)	адсутнасць унутранай свабоды	**4)**	навука	**6)**	на аснове дагматаў

В15. Устаўце ў прыведзеным тэксце на месцы пропускаў словы (словазлучэнні) з прапанаванага спіска, якія падыходзяць па сэнсе. Выбірайце словы (словазлучэнні) паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх у патрэбнай форме.

Існуюць унутрыасобасныя канфлікты, якія закранаюць матывы, каштоўнасці і самаацэнку чалавека. Напрыклад, **А)** _____ унутрыасобасны канфлікт характарызуецца сутыкненнем розных патрэб, інтарэсаў, жаданняў, схільнасцей чалавека, калі задавальненне адных патрэб выключае задавальненне другіх. Унутрыасобасны канфлікт неадэкватнай самаацэнкі апісваецца як канфлікт паміж «магу» і **Б)** _____. Прычынай дадзенага канфлікту выступае самападман або **В)** _____ чалавека прыняць сябе такім, які ён ёсць

1) матывацыйны	**3)** «трэба»	**5)** маральны
2) нежаданне	**4)** «магу»	**6)** гатоўнасць

В16. Устаўце ў прыведзеным тэксце на месцы пропускаў словы (словазлучэнні) з прапанаванага спіска, якія падыходзяць па сэнсе. Выбірайце словы (словазлучэнні) паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх у патрэбнай форме.

Грамадзянства – гэта **А)** _____ выяўляецца ў сукупнасці ўзаемных правоў, абавязкаў і адказнасці. Адным з неабходных патрабаванняў для набыцця грамадзянства Рэспублікі Беларусь па нараджэнні з'яўляецца **Б)** _____. Грамадзяніну Рэспублікі Беларусь гарантуецца абарона і заступніцтва дзяржавы **В)** _____

1) прававая сувязь чалавека і дзяржавы, якая
2) усведамленне сябе грамадзянінам сваёй краіны, якое
3) дасягненне ўзросту 18 гадоў
4) толькі на тэрыторыі Беларусі
5) наяўнасць грамадзянства Рэспублікі Беларусь у аднаго ці абодвух бацькоў дзіцяці
6) як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі

У заданні **В17** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАМІ****, парадак запісу лічбаў не мае значэння. Напрыклад:* **12**.

В17. Адзначце сказы, у якіх дапушчана сэнсавая памылка. Звярніце ўвагу: неабходна адзначыць НЯПРАВІЛЬНЫЯ сцверджанні!

1) Па ступені свабоды вылучаюць дасканалую і недасканалую канкурэнцыю. **2)** Найбольш распаўсюджанай формай канкурэнцыі з'яўляецца недасканалая. **3)** Да недасканалай канкурэнцыі адносяцца алігаполія, манапалістычная канкурэнцыя і сімвалічная канкурэнцыя. **4)** Алігаполія ўяўляе сабой невялікую колькасць (ад 2 да 5) буйных прадаўцоў, якія пануюць на рынку. **5)** Манапалістычная канкурэнцыя прадугледжвае існаванне на рынку толькі аднаго прадаўца тавару, які ўстанаўлівае сваю цану. **6)** Пры манапалістычнай канкурэнцыі важную ролю адыгрываюць рэклама, гандлёвыя маркі і знакі.

У заданнях **В18–В21** *адказ запішыце ў выглядзе* ***СПАЛУЧЭННЯ ЛІТАР І ЛІЧБАЎ****, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад:* **А1Б3В4**.

Памятайце, што адзін з варыянтаў, прапанаваных у правым слупку, з'яўляецца лішнім.

В18. Устанавіце адпаведнасць.

Від эканамічных рэсурсаў	Прыклад
А) працоўныя рэсурсы	**1)** абсталяванне
Б) прыродныя рэсурсы	**2)** людзі з рознай прафесійнай падрыхтоўкай
В) фінансавыя рэсурсы	**3)** грашовыя сродкі, выдзеленыя на вытворчасць
	4) зямля і яе нетры

В19. Устанавіце адпаведнасць.

Паняцце	Азначэнне
А) узровень дамаганняў **Б)** поспех **В)** самаацэнка	**1)** фактычны вынік дасягненняў чалавека, рэалізацыя мэт, пастаўленых ім у жыцці **2)** устойлівае, усвядомленае і выражанае ў слоўнай форме ўяўленне чалавека пра сябе **3)** каштоўнасць, значнасць, якімі надзяляе сябе чалавек як асоба ў цэлым, так і асобныя грані сваёй дзейнасці, паводзінаў, характару **4)** сукупнасць мэт, тое, чаго імкнецца дасягнуць чалавек у розных сферах (вучоба, кар'ера і інш.)

В20. Устанавіце адпаведнасць.

Эфект успрымання	Праяўленне
А) эфект навізны **Б)** эфект першаснасці **В)** эфект праекцыі	**1)** першае спрыяльнае ўражанне прыводзіць да негатыўнай ацэнкі яшчэ не вядомых якасцей чалавека **2)** пры ўспрыманні незнаёмага чалавека пераважае першая вядомая інфармацыя пра яго **3)** пры ўспрыманні знаёмага чалавека найбольш значнай аказваецца апошняя інфармацыя пра яго **4)** людзі прыпісваюць іншым якасці, якія ёсць у іх саміх

В21. Устанавіце адпаведнасць.

Тып палітычнага лідарства паводле зместу дзейнасці і іміджу	Характарыстыка
А) лідар-«гандляр» **Б)** лідар-«сцяганосец» **В)** лідар-«пажарны»	**1)** аператыўна рэагуе на надзённыя праблемы і абставіны **2)** умее ярка прадставіць выбаршчыкам свае праграмы, планы і выгадна абмяняць іх на падтрымку **3)** увасабляе ў жыццё «вялікую мару» і вядзе за сабой **4)** заўсёды атрымлівае ўладу на аснове веры людзей у незвычайныя, выдатныя якасці асобы

У заданні **В22** *адказ запішыце ў выглядзе* ***СПАЛУЧЭННЯ ЛІТАР І ЛІЧБАЎ****, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад:* **А1Б1В2Г2**.

Памятайце, варыянты, прапанаваныя ў правым слупку, могуць быць выкарыстаны некалькі разоў.

В22. Устанавіце адпаведнасць.

Характарыстыка падыходу да разгляду гісторыі грамадства	Назва падыходу
А) падыход узнік у другой палове XIX ст. **Б)** адным з прадстаўнікоў падыходу з'яўляецца У. Ростаў **В)** у межах падыходу вылучаецца такі этап у развіцці грамадства, як эра высокага ўзроўню масавага спажывання **Г)** падыход прадугледжвае, што кожны этап у развіцці грамадства характарызуецца пэўнай ступенню развіцця вытворчых сіл і адпаведным гэтай ступені тыпам эканамічных вытворчых стасункаў	**1)** фармацыйны падыход **2)** стадыяльны падыход